**УДК 821.161.3-1.09''321''''1930/9''**

**Садко Людміла Міхайлаўна**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
дацэнт кафедры рускай літаратуры
і журналістыкі
Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А. С. Пушкіна
Брэст, Беларусь

**Lyudmila Sadko**
PhD in Philology, Associate Professor
Associate Professor at the Department
of Russian Literature and Journalism
Brest State A. S. Pushkin University
Brest, Belarus
konovod1@yandex.ru

# МАТЫЎ ВЯСНЫ Ў ПАЭЗІІ П. БРОЎКІ 1930-х гг.

# THE MOTIF OF SPRING IN P. BROUKA'S POETRY OF THE 1930s

У артыкуле разглядаюцца матыў вясны і яго ўвасабленне ў лірыцы П. Броўкі 1930-х гг., удакладняецца метафарычны патэнцыял лейтматыва вясны, яго інварыянты і інтэрпрэтацыі праз вобразы маладосці, вітальнасці, абнаўлення, руху, земляробчай працы і язычніцкіх абрадаў. Робяцца вывады пра асаблівасці функцыянавання матыву вясны ў грамадзянска-патрыятычнай, «вытворчай» і інтымнай лірыцы. У выніку вызначаюцца ідэйна-тэматычныя дамінанты лірыкі паэта, у якой знітаваны рэпертурэмы футурызму (услаўленне тэхнікі і прагрэсу, культ маладосці і дынамічнасці, эксперыменты з рытмам і рыфмай), адлюстраванне эстэтыкі і паэтыкі часу сацыялістычных пераўтварэнняў («вытворчая» тэматыка, асаблівы герой-бальшавік), рысы народнай аксіялогіі (замілаванне роднай зямлёй, веданне архаічных земляробчых цыклаў, адносіны да зямлі як да жывой істоты, лірызм пачуццяў паміж юнаком і дзяўчынай).

Ключавыя словы: *П. Броўка*; *матыў*; *вясна*; *абнаўленне*; *футурызм*; *сацыялізм*; *народная аксіялогія.*

The article examines the motif of spring and its embodiment in P. Brouka's poetry of the 1930s. The author of the article clarifies the metaphorical potential of the leitmotif of spring, its invariants and interpretations through the images of youth, vitality, renewal, movement, agricultural work and pagan rites. Conclusions are made about the peculiarities of the functioning of the spring motif in civic-patriotic, "production" and intimate lyrics. As a result, the ideological and thematic dominants of the poet's lyrics are determined, which contain the repertoires of futurism (glorification of technology and progress, cult of youth and dynamism, experiments with rhythm and rhyme), and reflect the aesthetics and poetics of the time of socialist transformations ("production" theme, a special hero-Balshavik), the features of folk axiology (love of the native land, knowledge of archaic agricultural cycles, attitude to the earth as a living being, lyricism of feelings between a young man and a girl).

Key words: *P. Brouka*; *motif*; *spring*; *renewal*; *futurism*; *socialism*; *folk axiology*.

У беларускай літаратуры першай трэці XX ст. вылучаецца шэраг паэтаў (П. Шукайла, М. Чарот, А. Дудар, А. Александровіч, П. Броўка, М. Танк і інш.), чыя творчасць паяднала і сацыяльна-палітычныя падзеі часу, і мадэрнісцкае пакланенне перад вітальнасцю, адраджэннем, дынамізмам. Гэтыя маладосць і крэатыўная энергія новага ў процівагу цяжкаму мінуламу, духоўнай стомленасці, бяссіллю праявілі сябе ў многіх паэтычных эксперыментах сусветнай літаратуры пачатку XX стагоддзя. Вядома, што першапачаткова тэарэтык і практык авангардысцкага мастацтва Т. Марынэці

называў футурызм менавіта дынамізмам, маючы на ўвазе задачы зафіксаваць энергію руху, хуткасць, напорнасць розных з'яў і аб'ектаў. «В груди у нас огонь, ненависть, скорость!..» [1 с. 162], – адзначаў Марынэці, заклікаючы руйнаваць старое, з варожасцю глядзець на звыклыя традыцыі.

У творчасці беларускіх паэтаў-«маладнякоўцаў» знаходзяць адлюстраванне рэпертуарныя футурыстычныя мадэлі, якія з дапамогай прыёмаў адмысловых формаў, своеасаблівай урбаністычна-тэхналагічнай тэматыкі, арыгінальнай рытмічнай пабудовы верша перадаюць дынаміку ўзрушэння грамадства аж да касмічных маштабаў.

Раннія вершы Петруся Броўкі (1905–1980) увайшлі ў зборнікі «Гады як шторм» (1930), «Прамова фактамі» (1930), «Цэхавыя будні» (1931), «Паэзія» (1932), «Так пачыналася маладосць» (1934), «Прыход героя» (1935), «Вясна радзімы» (1937), «Кацярына» (1938, паэма). Частка вершаў П. Броўкі 1930-х гг. шмат у чым блізкія рыторыцы футурызму У. Маякоўскага, П. Шукайлы, рэвалюцыйнаму пафасу М. Чарота, неарамантычным рэпертурэмам М. Ціханава і Э. Багрыцкага. Як адзначае У. Гніламёдаў, «энергічнасць, тэмпераментнасць, лозунгавасць» [2, с. 151] адчуваюцца нават у назвах гэтых зборнікаў 1930-х гг. Крытык слушна заўважае: «Паэзія Броўкі 1930-х гадоў – гэта па-маладому страснае, бадзёрае, радаснае сцвярджэнне сацыялістычнай явы» [Там жа, с. 157].

Гэтае адчуванне ўздыму, натхнёнасці, яскравага энтузіязму пранізвае чырвонай ніткай пераважную большасць ранніх вершаў П. Броўкі, з'яўляецца вядучым матывам, маціфемай (А. Дандэс) ці, па вызначэнні расійскага літаратуразнаўцы Б. Гаспарава, прынцыпам «**лейтмотивного построения** повествования» (вылучана Б. Гаспаравым. – *Л. С.*) [3, с. 30]. Даследчык мае на ўвазе «принцип, при котором некоторый мотив, раз возникнув, повторяется затем множество раз, выступая при этом каждый раз в новом варианте, новых очертаниях и во все новых сочетаниях с другими мотивами» [Там жа].

Матыў паўстае як адначасова ўстойлівая і зменлівая структура, якая функцыянуе ў працэсе паўтораў за кошт пастаяннай часткі, абавязковай для ўсіх варыянтаў матыву, і варыятыўнай, дапаможнай часткі. Гэтыя семы як другарадны кампанент значэння звычайна абумоўленыя ядром матыву, але менавіта яны ў гэтай іерархізаванай полісістэме забяспечваюць цікавыя аўтарскія варыяцыі, інтэрпрэтацыі, увасабленні за кошт руху ў семантычнай перыферыі.

Семантычнае ядро лейтматыва вясны ўтварае ідэя аб супрацьпастаўленасці старога і новага і неабходнасці дынамізацыі, узрушэння і ўзнаўлення жыцця. Вясна (вітальнасць, абнаўленне, рух, змяненне) адлюстроўваецца ў прыроднай, сацыяльнай і інтымнай сферах.

«Радасна-ўзнёслая паэзія П. Броўкі канца 20-х і пачатку 30-х гадоў блізкая лірыцы маладнякоўцаў агульнасцю літаратурнай мэты – паказаць руйнаванне старога свету і нараджэнне новага» [4, с. 415], – піша М. Мішчанчук. Гэты скразны лейтматыў абнаўлення-руйнавання, маціфема

творчасці П. Броўкі шматразова, на розныя лады рэдуплікуецца, праяўляе сябе праз варыянтныя матывы «*майскага рання*» (верш «Майскім раннем я вас пакідаў…», 1926) [5, с. 20], свету, «*дня высокага, як сонца*» (верш «Радзіме») [5, с. 52], промняў, святла, маладосці, «*юнага палку*» (верш «Наперад маладых», 1930) [5, с. 36], «*маладых арлянят*» (верш «Янку Купалу») [5, с. 47], а таксама вясны ў шматлікіх варыянтах мастацкай трактоўкі (вершы «Вясновая размова», 1930 [5, с. 33–34]; «Мой кірунак», 1930 [5, с. 35]; «Красавік», 1934 [5, с. 55–57]; «Вясна на стадыёне», 1934 [5, с. 69–70]; «На полі першая раса», 1935 [5, с. 73]; «Вясной птушыны звонкі лёт», 1935 [5, с. 75]; «Садоўнік», 1935 [5, с. 87–88]; «Вясна Рэспублікі», 1935 [5, с. 94–98]; «Раніца», 1937 [5, с. 120–121]; «Палеская дарога», 1938 [5, с. 125–127]; «Неўміручы», 1938 [5, с. 131–132] і мн. інш.). Заяўленыя матывы могуць разглядацца на розных узроўнях мастацкага тэксту як структурна-семантычная адзінка, што праяўляе сябе ў ідэйна-тэматычнай, кампазіцыйнай, персанажнай і г. д. прасторах, форма існавання матыву, тэрміна-«пратэя» ў тэксце можа быць практычна любой.

Матыў вясны выразна заяўлены ў ранніх вершах П. Броўкі. У многіх народаў у розныя часы пачаткам года лічылася вясна. Яна прадстаўлена ў творах Броўкі як нараджэнне новага жыцця, уяўляе сабой момант, калі старое саступае дарогу новаму, агонь перамагае холад, а святло – цемру. Патрэбна адзначыць, што шэраг іншых паэтаў у сувязі з вядомымі кастрычніцкімі падзеямі адлік новага пачыналі менавіта з восені, з кастрычніка, аддавалі перавагу грамадзянскаму пафасу і сацыялагізатарскім патрабаванням. У П. Броўкі ўспрыманне веснавога абнаўлення адбываецца згодна архаічным уяўленням хлебароба, селяніна, як у вершы «Красавік»:

*Вясна. Красавік.*
*Наліваецца сінімі почкамі сад.*
*Вясна.*
*Гэта сонца ўладарна ідзе*
*Па палях.*
*Вясна.*
*Гэта – коні стаяць*
*Над павышанай нормай аўса.*
*Вясна –*
*Гэта грукае ў сцены зямля* [5, с. 55].

У вершы сімвалічна злучаюцца праявы нябёсаў (свет, промні, сонечны бляск) і зямлі (трактарны парк, маторы, пашня). Актант у гэтым вершы – брыгадзір, ён, як заўважае У. Гніламёдаў, «яскрава перадае аблічча і каларыт часу з яго працоўным энтузіязмам» [2, с. 157]. Але паэт добра памятае, аддаючы даніну футурыстычным рэпертурэмам, пра спрадвечныя веснавыя абрады і звычаі, цесна звязаныя з пачаткам земляробчых работ, з магіяй урадлівасці. Таму брыгадзір, акрылены вясною, выходзіць у поле, а яго фантазія малюе яркія карціны працы:

*З песняй прамчыць трактарыст.*
*І будзе ён валам валіць,*
*І ўдарыць магутнейшы гром,*
*І першая партыя рос*
*Кірункамі срэбра зайскрыць*
*Над пухам глыбокай раллі* [5, с. 56].

У радках верша матыў вясны ўвасабляецца цераз жаданне актанта абудзіць жыццёвыя сілы прыроды, даць ім на цэлы год магчымасць праявіцца. Вядома, што па вясне распаўсюджаны абрад хаджэння, ці катання, па свежай траве, па расе, таптання расы. Ён звязаны не толькі з аграрнай магіяй, але і з больш старажытным культам Зямлі, нездарма брыгадзір адухоўлівае яе, бачыць «*чорнае цела зямлі*», уяўляе, як «*зярняты ў зямлі / Напоўняцца сілы вялізнай, / Праз чорныя грудзі праб'юцца*» [5, с. 56]. М. Ярош, разважаючы пра асаблівасці творчасці П. Броўкі, піша: «Прастата і празрыстаць яго паэтычнага радка абумоўлены самымі цеснымі, трывалымі сувязямі з класічнымі набыткамі свайго народа» [6, с. 15]. Насамрэч, паэт таленавіта выкарыстоўвае і рэпертуарныя мадэлі вірлівага футурызму (напружаны рытм, магчымасці акцэнтнага верша), і традыцыйныя сродкі мастацкай творчасці (земляробчыя абрады, пачуццё роднай прыроды, тэмы сялянскага жыцця, канкрэтнасць дэталяў).

Лірыка П. Броўкі 1930-х гг. поўніцца грамадзянска-публіцыстычнымі вершамі, дзе аўтар паўстае як летапісец вірлівых сацыя-палітычных падзей эпохі. Героі такіх вершаў – цэлае пакаленне, што перажыло рэвалюцыю і вайну, а зараз мае надзею стаць гаспадаром свайго жыцця. Але паэзію П. Броўкі, па словах І. Баўтрэль, «цяжка ўявіць без вобразаў прыроды, якія так ці інача й прысутнічаюць ці не ва ўсіх найлепшых творах незалежна ад іх жанру, тэмы, ідэйнай задумы і г. д.» [7, с. 9].

Матыў вясны і адраджэння, новага жыцця паэт малюе выразнымі дынамічнымі штрыхамі, абагульняючы характары і абставіны аж да касмічных памераў, звяртаючыся да сродкаў гратэску і супрацьпастаўлення, максімальнай выразнасці. Так, верш «Вясна рэспублікі» заснаваны на кантрасце паміж старым і новым, паміж магільным холадам зімы прошлага жыцця і сонечнай вясной сённяшніх дзён:

*Так было, –*
*Што завеі непраходныя вылі.*
*Цемра, ноч навакол,*
*Дзе ні глянь, дзе ні кінь...*
*Вецер грукнуў усходні*
*Нястрымнаю сілай,*
*І пабеглі снягі*
*Сугрунём да ракі.*
*Сёння ж сонца*
*Рэспублікай смелае рушыць* [5, с. 94].

Матыў вясны паступова разгортваецца спачатку ў маштабных пейзажных замалёўках, якія напоўнены бясхмарным небам, салаўінымі песнямі, «*белым срэбрам яблынь, груш*», «*свечкамі каштанаў*», «*поўнымі рэкамі*» [5, с. 94–95]. Асаблівая ўвага надаецца і карціне вясны вачыма селяніна-земляроба:

*На калгасных палях*
*Неспакойнае зерне*
*Залатымі цвікамі*
*Прабівае палі* [5, с. 95].

Пры апісанні пpасторавага аспекту матыўнага комплексу вясны ў вершы «Вясна рэспублікі» звяртаюць увагу статусныя прыкметы топасаў, якія нясуць у сабе семантыку рэчыўнасці і канкрэтнасці абставін. Вясна і аднаўленне адбываюцца ў гэтым творы ў такіх разнастайных прыродных топасах, як «*рэкі*», «*неба*», «*лясы*», «*поле*», «*шлях*», «*дарогі*», «*балоты*», «*каналы*», «*сады*» [5, с. 94–98], а таксама ў канкрэтна-геаграфічных локусах, што сімвалізуюць інтэрнацыянальнае яднанне барацьбітоў за новае жыццё: «*З Украіны, / З-пад Волгі, / З Дагестана далёкага*» [5, с. 95]. Важна, што вядучы актант верша – палымяны бальшавік, з яго пазіцыі згаданыя топасы паўстаюць як свае, родныя, спрыяльныя.

Матыўны комплекс вясны паэт разгортвае і ў часавай перспектыве, успамінаючы герояў мінулага, што здабывалі новае жыццё цаною свайго асабістага, услаўляючы пераможную працу сённяшняга пакалення «*брыгадзіраў, калгаснікаў, бальшавікоў*»:

*Нашы дні абагналі*
*Старыя вякі,*
*Бо адменнага складу*
*Выраслі людзі*
*З гордым іменем цвёрдым –*
*Бальшавікі* [5, с. 97].

Гэтыя знешнія абставіны «*каласуючай зямлі*», «*трактароў*», «*самалётаў*», «*турбін*» [5, с. 97–98] прывядуць, на думку актанта верша, да ўнутранага пераўтварэння асобы, з’яўлення «новага чалавека». Пяшчоты сонца і новага дня абяцае П. Броўка «*дзецям шчасным нашым*», «*малагодкам*» [5, с. 98], іх будучыня малюецца асабліва радаснай.

Гэтая надзвычайная дакладнасць апісанняў, хранатопу, дэталёвасць ва ўзнаўленні малюнкаў роднай зямлі таксама праявілі сябе і ў вершы «Садоўнік» (1935), дзе паэт распавядае пра шчасце чалавека працы, які назірае за веснавым абуджэннем сада, адчувае гармонію змены гадавых цыклаў. Важна і тое, што герой верша, майстра-садоўнік, разумее сябе неад’емнай часткай гэтых прыродных працэсаў, яго працавітыя рукі і вопыт нараджаюць заўтрашні дзень сада, ён песціць дрэвы, а значыцца, стварае вясну, абуджае сілы дрэваў:

*Многа яблынь у садзе,*
*Каля плота прыніклі кусты.*
*Танканогія вішні*
*Абступілі вакол,*
*Грушы ўзнялі галовы,*
*І па голлі зялёным, густым*
*Захісталася возера цвету,*
*Беллю выслала дол.*

*Гэта шум сакавітай зямлі,*
*Свежай, поўнае сілы,*
*Пралятае па струнах кары,*
*Песні сонца бярэ…*
*І займаецца першая завязь,*
*Абсыпаючы белыя крыллі…*
*Ходзіць садам садоўнік*
*Шчаслівы між дрэў* [5, с. 69].

Як сведчыць назва верша «Вясна на стадыёне» (1934), паэт малюе вясну ў асаблівым месцы, на спартыўнай пляцоўцы, дзе ўладарыць спрыт, хуткасць, энергія і маладосць. Твор таксама заснаваны на матыве веснавога ўзрушэння, але падтрымліваецца ён своеасаблівымі вобразамі фізічнай паўнаты жыцця, здароўя, моцы, весялосці. Верш дэманструе характэрную савецкім ідэалагемам «вытворчую» тэматыку з асаблівым станоўчым героем, вобразамі ўсеагульнага шчасця, калектывізмам, узаемадапамогай, спалучае іх з футурысцкімі рэпертурэмамі вітальнасці, дынамізму, маладой энергіі:

*Планёры дружнай стайкай*
*Прамчаліся ў разгоне,*
*Глядзі, у зялёных майках*
*На вуліцы калоны.*
*Вясна на стадыёне!*
*Вясна на стадыёне!*

*Ах, маладосць, як жарты,*
*Як смех і радасць звоняць, –*
*Рыхтуемся ўпарта*
*Да працы, абароны.*
*Вясна на стадыёне!*
*Вясна на стадыёне!* [5, с. 69].

Майстэрства П. Броўкі-лірыка, адметныя ўзоры інтымных вершаў, створаных на хвалі шчырасці і пяшчоты (напрыклад, вершы «Пахне чабор», «Александрына», «Ты мне здавалася адзінай…»), сфарміруюцца пазней, але ўжо ў ранніх творах знаходзяцца прыклады пранікнёнасці, тонкай псіхалагізацыі, удалага выяўлення пачуццяў юнака і дзяўчыны. Матыў вясны набывае ў вершы «На полі першая раса» (1935) асаблівае напаўненне. Паэт стварае гімнічны спеў маладосці і першаму пачуццю кахання:

*На полі першая раса.*
*І сталі яблыкі цвісці…*
*Мы толькі ўвайшлі ў сад,*
*Як многа нам з табой ісці* [5, с. 73].

Верш гучыць абяцаннем шчасця, веснавымі спадзяваннямі, радасцю ад магчымасцяў юнака і дзяўчыны, якім «*вучыцца, жыць, спяваць, расці*». Актант з замілаваннем гаворыць аб доўгіх шляхах па вясновым садзе маладога жыцця:

*Шляхоў у нас прыгожых шмат,*
*Над імі зоры ўсплылі.*
*Які прыгожы гэты сад.*
*Куды мы толькі ўвайшлі!* [5, с. 73].

Безумоўна, у творы выкарыстоўваюцца архетыпічныя вобразы. Напрыклад, «*прыго-жыя шляхі*», якія чакаюць герояў гэтага верша, маюць выразныя перазовы з вобразам дарогі, падарожжа, што ў славянскай касмасофіі займае адно з важных месцаў. Дарога тут атаясамліваецца і з жыццём і яго перспектывамі, і з амбівалентным топасам, які адначасова злучае і падзяляе свет на «сваё» і «чужое». Дарога можа трактавацца і праз апазіцыйную пару «жыццё–смерць», што ляжыць у аснове многіх абрадавых комплексаў, пры гэтым матыў падарожжа як пераходу ў іншы стан займае ў іх найважнейшае месца. У дарозе герояў чакаюць выпрабаванні, падарожжа паўстае і як шлях да самога сябе, спазнання ісціны. Малады вясновы настрой закаханых абяцае ім ідэальны шлях, асвечаны зорамі і сагрэты цеплынёй рук.

Узгадваецца ў вершы «На полі першая раса» і архаічны вобраз сада як райскага месца. Сад, у адрозненне ад іншых топасаў, традыцыйна малюецца як месца абмежаванае і выдзеленае ад навакольнай, непрыязнай чалавеку прасторы. Вядома, што ў славянскім фальклоры сімваламі радасці, шчасця, дабра з'яўляўся квітнеючы сад, дзе зелянеюць дрэвы і цвітуць кветкі. Гэтая традыцыйная сімволіка дарогі і саду, матыў вясны, выкарыстаныя П. Броўкам, маюць пеазовы з рэпертурэмамі савецкага «праекта»: пафасам стваральнага энтузіязму, самаадданай веры ў заўтрашні дзень.

Прадаўжэнне лірычнага ўвасаблення матыву вясны – верш «Вясной птушыны звонкі лёт…», які малюе амаль старажытна-архаічны паэтычны свет адзінства чалавека і прыроды:

*Вясной птушыны звонкі лёт*
*І белы па садах агонь,*
*І, як дзявочы карагод,*
*Чаромхі кругам ля акон* [5, с. 75].

У вершы выразна адухоўлены з'явы навакольнай рэчаіснасці, створаны вобраз хараства бурлівай вясны. Гэтая гарманічная злітнасць з прыродай у вершы П. Броўкі малюецца як апора для чалавека і крыніца яго сіл. У творы шматкроць паўтараюцца вобразы карагода, вянка, круга як вечнага аднаўлення, а архаічны абрад пляцення вянкоў з кветак, апісаны паэтам, – таксама сімвал сонца, узнаўлення жыцця, плоданашэння зямлі. Аўтар упэўнены, што ў новым жыцці больш не будзе цяжкасцей і выпрабаванняў:

*Пяюць сяброўкі,*
*З медуніц*
*Вянкі прыгожыя плятуць.*

*Плятуць з рамонкамі яшчэ,*
*Каб потым шчасце адружыць,*
*Ніколі болей на рацэ*
*Пра лёс не трэба варажыць* [5, с. 75].

Вясеннія кветкі – рамонкі і медуніцы, што згадвае П. Броўка ў вершы «Вясной птушыны звонкі лёт», маюць сваю трывалую сімвалічную канатацыю, у славян гэтыя флоравобразы звязаны з сонцам, радасцю, юнацтвам і чысцінёй.

Намі выяўлена, што ў вершах П. Броўкі 1930-х гг., дзе рэалізуецца матыў вясны, новага жыцця, вобразы прыроды сугучныя з перажываннямі, псіхалагічным настроем чалавека (брыгадзіра, садоўніка, трактарыста, спартсмена, камунара, рабочага, бальшавіка, камсамольца і г. д.), маладога героя часу сацыялістычных пераўтварэнняў. Вясна мае арыгінальную канатацыю ў вершах грамадзянскага накірунку, яна атаясамліваецца з грамадскімі і сацыя-палітычнымі зменамі, выклікае ў актанта душэўны ўздым, стан захопленасці, закаханасці ў новае жыццё.

Зварот П. Броўкі да матыву вясны, аднаўлення на розных узроўнях мастацкага тэксту рэалізуе некалькі мэтаў: адлюстроўвае як дамінанты эстэтыкі і паэтыкі футурызму (услаўленне тэхнікі і прагрэсу, культ маладосці і дынамічнасці, эксперыменты с рытмам і рыфмай), так і рысы народнай аксіялогіі (замілаванне роднай зямлёй, веданне архаічных земляробчых цыклаў, адносіны да зямлі як да жывой істоты, лірызм пачуццяў паміж юнаком і дзяўчынай).

ЛІТАРАТУРА

1. *Маринетти, Ф. Т.* Первый манифест футуризма / Ф. Т. Маринетти // Называть вещи своими именами: Программные выступления мастеров западноевропейской литературы. – М. : Прогресс, 1986. – С. 158–162.
2. *Гніламёдаў, У. В.* Упоравень з векам / У. В. Гніламёдаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1976. – 272 с.
3. *Гаспаров, Б.* Литературные лейтмотивы. Очерки по русской литературе XX века / Б. Гаспаров. – М. : Наука, 1993. – 304 с.
4. *Мішчанчук, М.* Пятрусь Броўка / М. Мішчанчук // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі ; Ін-т літаратуры імя Я. Купалы. – Мінск : Беларуская навука, 1999. – Т. 2. – 903 с.
5. *Броўка, П.* Збор твораў у 4 т. / П. Броўка. – Мінск : Беларусь, 1965. – Т. 1 : Вершы і паэмы 1926–1940 гг.– 356 с.
6. *Ярош, М.* Пятрусь Броўка: Нарыс жыцця і творчасці / М. Ярош. – Мінск : Нар. асвета, 1981. – 120 с.
7. *Баўтрэль, І.* Паэзія Петруся Броўкі: дарога да мастацтва / І. Баўтрэль // Роднае слова. – 2010. – № 6. – С. 8–12.

*Поступила в редакцию 10.05.2022*